*References:*

1. Ahmanova, O. S. (1957). Ocherki po obshhej i russkoj leksikologii [Essays on General and Russian Lexicology]. – Moscow: Uchpedgiz Publ. (In Russ.).

2. Druzhina, N. L. (2016). Universal'noe i idiojetnicheskoe v vosprijatii fenomena sem'i russkimi, belorusami i nemcami [Universal and idioethnic in the perception of the family phenomenon by Russians, Belarusians and Germans]. Filol. nauki, 2, 21-26. (In Russ.).

3. Slavjanskie cennosti v kommunikativnom prostranstve regionov: kollektivnaja monografija (2017). [Slavic values in the communicative space of regions: a collective monograph]. Ed. V. A. Maslova, M. Vas. Pimenova. – Minsk: Jenciklopediks Publ. (In Russ.).

УДК 811.161.3:39(=161.3):37

## АСВЕТА Ў БЕЛАРУСКАЙ ЭТЫЧНАЙ КАНЦЭПТАСФЕРЫ

*К.С. Півавар*

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка,*

*Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава*

У артыкуле канцэпт “асвета” разгледжаны ў святле лінгвакультуралогіі як аксіялагічна значны канцэпт, у складзе якога выдзяляюцца наступныя кампаненты: вобразны (кніга, галава, ежа для розуму, галава), паняццевыя (‘важнасць асветы ў жыцці чалавека’, ‘адукаванасць – галоўная рыса сапраўднага чалавека’, ‘важная роля сям’і і школы ў навучанні’, ‘навучанне – нялёгкі працэс, даступны не ўсім’ і г. д.), ярка выражаны каштоўнасны кампанент. Навуковая навізна артыкула заключаецца ў выяўленні багатага культурнага фону і аксіялагічнага зместу канцэпту “асвета” на матэрыяле кантэкстаў з беларускамоўных крыніц (у першую чаргу, у літаратурных і фальклорных афарызмах). Атрыманыя вынікі могуць знайсці прымяненне ў далейшых даследаваннях – як лінгвістычных, так і ў гуманітарных увогуле (сацыялогія, псіхалогія, этналогія, педагогіка). Выяўлена цесная сувязь даследаванага канцэпту з канцэптамі “сям’я”, “памяць”, “праца”, “дабрабыт”, “чалавек”.

*Ключавыя словы:* канцэпт, асвета, моўная карціна свету, літаратурны і фальклорны афарызм, мастацкі тэкст.

## EDUCATION IN THE BELARUSIAN ETHICAL CONCEPT SPHERE

*K.S. Pivavar*

*Belarusian State Pedagogical M. Tank University,*

*Vitebsk State University named after P.M. Masherov*

The article considers the concept of “education” in the light of cultural-oriented linguistic as an axiologically significant concept, which includes the following components: figurative: book (head, head, food for the mind, head), conceptual (‘the importance of education in human life’, ‘education - the main feature real person ‘,’ important role of family and school in learning’,’ learning is a difficult process, not available to everyone ‘, etc.), a strong value component. The scientific novelty of the article is to reveal the rich cultural background and axiological content of the concept of “education” on the material of contexts from Belarusian-language sources (primarily in literary and folklore aphorisms). The obtained results can be used in further research – both linguistic and humanities in general (sociology, psychology, ethnology, pedagogy). The close connection of the researched concept with the concepts “family”, “memory”, “work”, “welfare”, “person” is revealed.

*Key words:* concept, education, linguistic picture of the world, literary and folklore aphorism, literary text.

Канцэпт разумеецца як аператыўная змястоўная адзінка памяці, усёй карціны свету, адлюстраванай у чалавечай псіхіцы; ён служыць тлумачэнню адзінак ментальных ці псіхічных рэсурсаў свядомасці і той інфармацыйнай структуры, якая адлюстроўвае веды і вопыт чалавека. Канцэпт можна разглядаць як адну з форм арганізацыі кагніцыі – пазнавальнай дзейнасці чалавека. Намінатыўнае поле канцэпту “асвета”, на нашу думку, складаецца з наступных лексем: *навука* (у беларускай мове гэтае слова з’яўляецца сінонімам навучання), *вучэнне, адукацыя*, а таксама (у пэўных кантэкстах) назоўнік *розум.*

Мэта артыкула – на матэрыяле літаратурных і фальклорных афарызмаў змадэляваць змест канцэпту “асвета”, вызначыць яго структуру (вобразны, каштоўнасны, паняццевыя кампаненты, уявіць месца дадзенага лінгваментальнага ўтварэння ў канцэптасферы беларускай мовы. Крыніцай даследавання паслужылі літаратурныя і фальклорныя афарызмы [1$ 2], а таксама кантэксты з мастацкай літаратуры і публіцыстыкі. У сучаснай лінгвістыцы прадстаўлена вялікая разнастайнасць метадаў і спосабаў апісання структур асобных канцэптаў у розных моўных карцінах свету. Мы прытрымліваемся лінгвакультуралагічнага аналізу моўных адзінак, прапанаванага В.А. Масла-вай, М.У. Піменавай, М.Л. Каўшовай і інш., якія прапануюць выдзяляць у структуры канцэпту намінатыўнае поле, каштоўнасны, вобразны, паняццевы кампаненты.

Тэрмін “канцэптасфера” ў навуковы ўжытак увёў Д. С. Ліхачоў у артыкуле “Канцэптасфера рускай мовы” на ўзор тэрмінаў В. І. Вярнадскага “наасфера”, “біясфера”; гэты тэрмін дапамагае зразумець, чаму мова “з’яўляецца не проста спосабам камунікацыі, але і нейкім канцэнтратам культуры нацыі і яе ўвасаблення ў розных слаях насельніцтва аж да адной асобы. У аснове канцэптасферы народа ляжыць спецыфічная сістэма сацыяльных, культурных і моўных стэрэатыпаў. Нацыянальная своеасаблівасць моўнай карціны свету вызначаецца спецыфікай зместу канцэптаў. Пранікненне ў канцэптасферу дазваляе лепей зразумець светаадчуванне і паводзіны людзей, раскрывае ўніверсальныя, уласцівыя канцэптасферам усіх народаў, і нацыянальна-спецыфічныя рысы. Сукупнасць устойлівых канцэптаў утварае канцэптасферу мовы, з’яўляецца сціснутым, “алгебраічным выразнікам усёй культуры нацыі” [3, с. 3]. Раскласіфікаваныя па тэматычнай прымеце канцэпты ўтвараюць псіхалагічную, этычную, фізіялагічную канцэптасферу і г. д. Існуюць нацыянальная, прафесійная, гендарная, узроставая канцэптасферы, а таксама індывідуальная канцэптасфера асобнага аўтара.

Сучасны стан развіцця гуманітарнай навукі характарызуецца міждысцыплінарнасцю, якая адкрывае новыя магчымасці і метады даследаванняў для мовазнаўцаў. Пры вылучэнні ключавых канцэптаў намі выкарыстаны дадзеныя сацыялогіі. Так, у адным з апошніх даследаванняў грамадскай думкі вучоныя прыйшлі да высновы, што для маладога пакалення беларусаў найвялікшымі каштоўнасцямі з’яўляюцца сям’я, здароўе і адукацыя: “першае месца ў іерархіі жыццёвых каштоўнасцяў навучэнцаў займае сям’я (каля 85% апытаных). Далей ідуць такія каштоўнасці, як здароўе (73,7%) і добрая адукацыя (65,3%)” [4]. Каштоўнасць адукацыі прасочваецца ў шматлікіх фальклорных і літаратурных афарызмах: *Вучыся, нябожа, вучэнне паможа* (Я. Купала. Вучыся, нябожа); *Навука даражэй за ўсякае багацце* (Прык.); *Навука – лепшае багацце* (Прык.); *Вучыцца заўсёды згадзіцца* (Прык.); *Вучэнне – свет, а невучэнне – цемра* (Прык.); *Лепей вучоны, як залачоны* (Прык.). Каштоўнасны кампанент праяўляецца ў высокай характарыстыцы адукаванага чалавека, сцвярджэнні таго, што неадукаваны чалавек не мае права называцца сапраўдным чалавекам: *Не кручаны – не рэмень, не вучаны – не чалавек* (Прык.); *Розум – найлепшае багацце* (Прык.).

Вобразны кампанент дадзенага канцэпту абумоўлены трывалымі асацыятыўнымі сувязямі, якія існуюць у беларускай моўнай свядомасці. Адным з самых вядомых сімвалаў асветы, адукацыі, навучання, безумоўна, з’яўляецца кніга. Яшчэ ў XVI ст. беларускі асветнік Францыск Скарына пісаў: *Любіце кнігу, бо яна – крыніца мудрасці, ведаў*

*і навукі, лекі для душы* (Францыск Скарына). Гэты вобраз адзначаны і ў народнай афарыстыцы: *Кніжка чалавеку – што ліпа пчолцы* (Прык.); *Як многа чытае, то многа ведае* (Прык.). Выяўлена таксама падабенства атрымання ведаў з ужываннем ежы, калі апошняя сілкуе цела чалавека, то адукацыя – душу: *Веды – таксама ежа, разумовая, але ежа, і яна таксама можа быць не на карысць чалавеку, яна таксама можа шкодзіць, і ад яе таксама неабходна час ад часу разгружацца – пасціць* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

Вобразны кампанент прадстаўлены звыклыя для беларусаў асацыяцыі – сяўба, зерне, вырошчванне хлеба (дадзеныя вобразы адзначаны намі ў апісанні канцэптаў праца, дабрабыт, памяць): *Браты! Вялікая дарога / Чакае нас і родны край – / Жніво настала, працы многа, – / Навукі семя засявай!* (Я. Колас. Да працы!); *Так патрабуе ўжо ў калысцы / Дагляду мудрага дзіця, / Каб у жыцці аратым выйсці, / А не нахлебнікам жыцця!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

У многіх народаў шырока прадстаўлены саматычны код культуры. Універсальным, на нашу думку, з'яўляецца ўяўленне ў многіх народаў галавы як канцэнтрацыі рацыянальнага пачатку чалавека, разумовай дзейнасці, а таму гэты вобраз звязаны і з асветай і адукацыяй: *За разумнаю галавою і рукам лёгка* (Прык.); *Кожная галава свой розум мае* (Прык.); *Галава – не булава, мазгі – не пілаванне* (Прык.); *Ад навукі галава не баліць* (Прык.).

Нацыянальная канцэптасфера ўключае ў сябе наіўную карціну свету дадзенай мовы, якая фарміруе вобразны складнік канцэптаў, нацыянальную сістэму каштоўнасцей, што ўтварае ацэначны складнік канцэптаў і пэўную суму інфармацыі, неабходную для паспяховай камунікацыі ў межах дадзенай культуры. Гэтая сума інфармацыі, як навуковай, так і бытавой, як сапраўднай, так і непраўдзівай, фарміруе паняццевыя складнікі канцэптаў, якія з'яўляюцца вынікам шматгадовай аб'ектывацыі ўласнага вопыту.

Як сведчыць даследаваны матэрыял, важнай з'яўляецца перадача ведаў маладому пакаленню, у працэсе чаго выключную ролю адыгрываюць бацькі, а таксама настаўнікі: *Дзеці павінны ўзбагачацца вопытам бацькоў* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал); *Каб выбраць лепшую з дарог, / Патрэбна мудрасць працы / Нашых сэрцаў; / Патрэбны маці, бацька, педагог* (П. Панчанка. Ратуйце нашы душы); *Школа для таго, каб людзі маглі перадаць адзін аднаму сваю багатую душу* (В. Каваленка. Падвышанае неба); *Калі б можна было без настаўніка, то бараны б чыталі кніжкі* (Прык.); *Табе зайздрошчу светла, мой настаўнік, / няўтомнай эрудыцыі тваёй, / тваёй святой няволі, – толькі ў ёй / душа бяднець і старыцца не стане* (В. Жуковіч. Перада мною вобраз твой паўстане…). Таму можна вызначыць сувязь канцэптаў "асвета" і "сям'я". Па нашым меркаванні, аднымі з самых вядомых сярод беларусаў з'яўляюцца радкі з паэмы Я. Коласа "Новая зямля": *"Калі навука пойдзе туга, паможа бацькава папруга"*, у якіх праглядаецца прынцып этнапедагогікі – дапушчэнне фізічных пакаранняў у выпадку беспаспяховага навучання дзіцяці. Безумоўна, сучасная педагогіка адмаўляе дадзены прынцып, аднак мова працягвае захоўваць народную памяць, што вельмі важна для яе даследчыкаў.

Некаторыя мастацкія тэксты патрабуюць дадатковага лінгвакультуралагічнага каментарыя. Так, у паэме Н.Гілевіча вартымі ўвагі з'яўляюцца наступныя радкі: *Вучы дзяцей яшчэ з пялёнак: / Каб не скаціцца пад адхон – / Хай з курганоў тваіх зялёных / Бяруць у заўтрае разгон* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці). Курган – высокі старадаўні магільны насып. У беларускай моўнай свядомасці курган звязаны з магілай дзядоў, продкаў, з'яўляецца сімвалам памяці (узгадаем адзін з самых вядомых мемарыялаў Вялікай Айчыннай вайны – Курган славы ў Мінскай вобласці). Такім чынам, можна сцвярджаць, што канцэпт "асвета" мае глыбінную сувязь з канцэптам "памяць".

Асвета, навучанне – важны феномен у жыцці чалавека, але адукаваным не так проста стаць: *Без му́кі няма навукі* (Прык.); *Гуляючы, розуму не прыдбаеш* (Прык.).

У шматлікіх парэміях падкрэсліваецца, што розум, у адрозненне ад матэрыяльных рэчаў, нельга набыць ці знайсці: *Навука не піва, у рот не ўвальеш* (Прык.); *Нікому свайго розуму не ўставіш* (Прык.); *Розум не кулеш, у галаву не ўвальеш* (Прык.); *Розум не сякера – не пазычыш* (Прык.); *Розуму ў чужую галаву лапатаю не накладзеш* (Прык.); *Золата і ў краме дастанеш, а розуму не прыставіш* (Прык.); *За багацце розуму не купіш* (Прык.). Аб'екты параўння (кулеш, піва, сякера, лапата) з'яўляюцца прадметам даследавання лінгвакраіназнаўства як цікавыя факты паўсядзённага побыту беларусаў. Ці, напрыклад, прыказка *Розуму на кірмашы не купіш і ў Слаўкаўшчыне не знойдзеш* утрымлівае лексемы з этнакультурным значэннем *кірмаш* ('святочна абстаўлены расшыраны гандаль, які праводзіцца ў пэўную пару года ў пэўнай мясцовасці; у пераносным значэнні – шумнае, ажыўленае зборышча людзей') і *Слаўкаўшчына* ('вялікая і багатая пушча на поўдні Беларусі (Глускі і Любанскі раёны').

У беларускай афарыстыцы падкрэсліваецца неабходнасць адукацыі для годнага існавання: *Без навукі і лапця не сплявеш* (Прык.); *Навука вочы адчыняе* (Прык.), у чым нам бачыцца сувязь з канцэптам "дабрабыт".

Навучанне – працяглы працэс, які немагчыма завяршыць: *Век жывеш, век вучышся* (Прык.); *Вучыцца ніколі не позна* (Прык.); *Колькі робіш – столькі вучыся* (Прык.); *Пражыць, як гавораць, - не поле перайсці, / Вучыцца не позна ніколі* (П. Броўка. Пражыць, як гавораць); *Што жывём, то вучымся* (Прык.). Прычым найлепшы час для навучання – маладосць: *Вучыся зáмаладу, то на старасць як знойдзеш* (Прык.); *Жалеза куй – як гарачае, вучыся – як вучыцца* (Прык.).

Разам з тым, падкрэсліваецца, што не кожнаму даецца навука: *Дурнога вучыць, як мёртвага лячыць* (Прык.). Да неадукаваных, неразумных людзей існуе негатыўнае стаўленне ў грамадстве: *Век пражыў, а розуму не нажыў* (Прык.); *Да званіцы падняўся, а без розуму застаўся* (Прык.).

Прааналізаваны моўны матэрыял дае цікавую інфармацыю для іншых гуманітарных навук, у тым ліку для этнапедагогікі, бо ў афарыстыцы адлюставаны шматгадовыя назіранні народа, выкладзены парады. Напрыклад, сцвярджаецца, спрыяльным для навучання, асветы з'яўляецца асяроддзе чалавека: *З разумным на добрае навучышся, а з дурным – развучышся* (Прык.); *Розуму не набярэшся, калі з дурнем павядзешся* (Прык.). Заўважана, што маўленчыя паводзіны з'яўляюцца адлюстраваннем разумовых здольнасцей чалавека: *Які розум – такая гаворка* (Прык.). Наяўнасць адукацыі павінна спалучацца ў чалавека са сціпласцю: *Мудры будзь, але не мудруйся* (Прык.). Цікавым з'яўляецца назіранне над тым, што адсутнасць матывацыі не спрыяе паспяховай адукацыі: *Сытае бруха да навукі глуха* (Прык.).

Канцэптасфера як сукупнасць канцэптаў, зафіксаваная ў культурнай памяці социума і/ці індывіда, складае аснову нацыянальнай кагнітыўнай базы і з'яўляецца крыніцай канцэптаў, ментальнымі праекцыямі якіх у мове з'яўляюцца знакі, канцэпты, сімвалы, вобразы. Канцэптасфера ў многім абумоўлівае менталітэт асобы, групы, народа, г.зн. характар, паводзіны, лад мыслення.Чым багацейшая культура нацыі, фальклор, літаратура, навука, выяўленчае мастацтва, гістарычны вопыт, рэлігія, тым багацейшая і канцэптасфера народа. Моўная экспплікацыя канцэптаў здзяйсняецца праз ключавыя словы і матывы, якія могуць разглядацца і ў рамках асобнага мастацкага твора пісьменніка, і ў інтэртэкстуальных сувязях. Канцэптасфера ўяўляе сабой сістэму, бо канцэпты ўзаемазвязаны паміж сабой. Як паказала наша даследаванне, канцэпт "асвета" мае сувязь з канцэптамі "чалавек", "сям'я", "памяць", "праца", "дабрабыт".

*Спіс крыніц:*

1. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склад. Ф. Янкоўскі ; прадм. Д.Я. Бугаёва. – Мінск : Беларуская навука, 2004. – 494 с.
2. Гаўрош, Н. В. Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў / Н. В. Гаўрош, Н. М. Нямковіч. – Мінск : Вышэйшая школа, 2012. – 638 с.
3. Лихачев, Д. С. Концептосфера русского языка / Д. С. Лихачев // Известия РАН. Сер. литературы и языка. – 1993. – Т. 52. – № 1. – С. 3–9.
4. Нікалаева, Н. У ТОПе жыццёвых каштоўнасцяў у школьнікаў – сям'я, здароўе і адукацыя [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://zviazda.by/be/news/20170830/1504105512. – Дата доступу: 31.03.2022.

References

1. Jankoŭski F. (2004). Belaruskija prykazki, prymaŭki, frazealagizmy [Belarusian proverbs, sayings, idioms]. – Minsk: Belaruskaja navuka (In Bel.).
2. Gaŭrosh, N. V. (2012). Afarystychnyja vysloŭi belaruskih pis'mennikaŭ [Aphoristic sayings of Belarusian writers]. – Minsk: Vyshjejshaja shkola (In Bel.).
3. Lihachev, D. S. (1993). Konceptosfera russkogo jazyka [Conceptosphere of the Russian language] Izvestija RAN. Serija literatury i jazyka, 52, 1, 3–9. (In Russ.).
4. Nikalaeva, N. (2017). U TOPe zhyccjovyh kashtŷnascjaŷ u shkol'nikaŷ – sjam'ja, zdaroŷe i adukacyja. Retrieved from http://www. zviazda.by/be/news/20170830/1504105512